NACIONALINĖ ŠVIETIMO AGENTŪRA

2023

________________________________________

(mokykla)

______ klasės mokinio (-ės) ________________________________

(vardas ir pavardė)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

Mokyklinio brandos egzamino užduotis
(pagrindinė sesija)

2023 m. birželio 22 d.

NURODYMAI

- Patikrinkite, ar egzamino užduočių sąsiuvinyje nėra tuščių lapų arba kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
- Užrašykite savo miestą, mokyklą, klasę, vardą ir pavardę tam skirtoje užduoties sąsiuvinio vietoje.
- Rašykite aiškiai, įskaitomai juodai rašančiu rašikliu. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima. Neaiškiai parašyti, pribraukyti, už ribų parašyti atsakymai vertinami 0 taškų.
- Atlikdami teksto suvokimo užduotis (II egzamino dalis), į klausimus atsakykite glaustai ir aiškiai. Jūsų atsakymai turi tilpti paliktose eilutėse.
- III egzamino dalyje pateiktos trys rašinio temos ir du tekstai interpretacijai. Įdėmiai juos perskaitykite, pasirinkite ir parašykite vieną rašinį arba vieną teksto interpretaciją.
- Turite parašyti 250–400 žodžių (A4 formato 1,5–2 psl.) tekstą. Vertinant bus atsižvelgiama ir į darbo apimtį. Švarraštyje suskaičiuokite žodžius. Paraštėje **pažymėkite 250 žodžių ribą**.
- Jeigu pirmiausiai rašote juodraštyje, pasilikite pakankamai laiko darbui perrašyti į švarraštį. **Juodraštis nebus tikrinamas ir vertinamas.**

Linkime sėkmės!

VERTINIMAS

| **II dalis (teksto suvokimas)** | **III dalis (teksto kūrimas)** | **TAŠKŲ SUMA** |
|---|---|---|
| 30 taškų | 40 taškų | 70 taškų |
| | | |

Vertinimo komisija: ______________________________

(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________

(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________

(parašas, vardas ir pavardė)

II egzamino dalis

# TEKSTO SUVOKIMAS

## ТЭКСТ А

*Прачытайце тэкст і выканайце змешчаныя пасля яго заданні.*

У. Караткевіч

### БАЦЬКАЎШЧЫНА

Дагарэў за брамай небакрай,
Месяц паміж воблачкаў плыве.
Выйду зноў, як у мінулы май,
Басанож прайдуся па траве.
Дымная, сцюдзёная раса,
Цёмныя ў траве ад ног сляды.
А такога рослага аўса
Я не бачыў доўгія гады.
Бач, хмызы спляліся, як павець,
Светлякі мігцяць, гараць святлей.
Перад тым як звонка ў лозах пець,
Прачышчае горла салавей.
Лашчыцца трава да босых ног.
З дальніх паплавоў плыве ракой
Ледзь прыкметны сумны халадок –
Подых юні ўходзячай маёй.
Паімчаць за ёю наўздагон? –
Хоць і схопіш – усё адно падман.
Дзе каханне тых мінулых дзён –
Весніх паркаў бэзавы туман?
Нават шкадаванне – дзе яно?
Зноў вясна, і жаль знікае зноў.
(Так губляюць пах перад вясной
Ссохлыя сцяблінны палыноў.)
Ціха цмокае у сне рака.
О, як добра, як прыгожа жыць!
Раска, як русалчына луска,
На вадзе ад месяца гарыць.
А вакол травіцы роснай рай
І бярозак белая сям'я.
Мой чароўны беларускі край,
Бацькаўшчына светлая мая!

*Заданні да тэксту*

| | *Балы* | |
|---|---|---|
| *I* | *II* | *III* |

**1.1.** Вызначце, да якога роду літаратуры адносіцца гэты твор.

**А** Эпас
**Б** Лірыка
**В** Драма

*(0,5 бала)* ___ ___ ___

**1.2.** Адзначце асаблівасці гэтага роду літаратуры.

**А** На першым плане падзея.
**Б** На першым плане эмоцыя, перажыванне, думка.
**В** Не мае сюжэта.
**Г** Паказвае чалавечыя характары ў развіцці.
**Д** Жыццё паказваецца праз дзеянне, дыялог, узаемаадносіны паміж персанажамі.

*(1 бал)* ___ ___ ___

**2.** Сфармулюйце тэму верша.

____________________________________________________________

____________________________________________________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

**3.** Назавіце **чатыры** пачуцці, якія абудзіла ў лірычнага героя сустрэча з мілымі сэрцу мясцінамі.

____________________________________________________________

____________________________________________________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

**4.** Якія радкі верша найбольш выразна перадаюць захапленне лірычнага героя сваёй Бацькаўшчынай?

____________________________________________________________

____________________________________________________________

*(0,5 бала)* ___ ___ ___

**5.** Чаму, на вашу думку, паэт называе Бацькаўшчыну *светлай*?

____________________________________________________________

____________________________________________________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

**6.** Уявіце, што вы атрымалі заданне намаляваць ілюстрацыю да гэтага верша. Назавіце **чатыры** створаныя паэтам карціны прыроды, якія вы выкарысталі б для свайго малюнка.

____________________________________________________________

____________________________________________________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 1–6 *(макс. 7 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

| | Балы I | II | III |
|---|---|---|---|
| **7.** Светлы сум і радасць ад сустрэчы з мінулым, памятнымі мясцінамі перадаюцца ў вершы яркімі сродкамі мастацкай выразнасці. Назавіце па **тры** прыклады пералічаных ніжэй тропаў.<br><br>Эпітэты: ____________________<br>____________________<br><br>Метафары: ____________________<br>____________________<br><br>*(3 балы)* | ___ | ___ | ___ |
| **8.** Абапіраючыся на змест верша, закончыце сказ:<br>*Выкарыстоўваючы параўнанне* ***як русалчына луска****, аўтар маляўніча апісвае...*<br>____________________<br>____________________<br><br>*(0,5 бала)* | ___ | ___ | ___ |
| **9.** *Інверсія* – незвычайны парадак слоў у сказе, які стварае своеасаблівы настрой. Прывядзіце **два** прыклады інверсіі з твора.<br>____________________<br>____________________<br><br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **10.** Растлумачце, як вы разумееце словы<br>*Паімчаць за ёю наўздагон? –*<br>*Хоць і схопіш – усё адно падман.*<br>____________________<br>____________________<br><br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **11.** Якім уяўляецца вам лірычны герой?<br>____________________<br>____________________<br><br>*(2 балы)* | ___ | ___ | ___ |
| **12.** Выпішыце **тры** прыклады назоўнікаў у памяншальна-ласкальнай форме, якія перадаюць улюбёнасць паэта ў родныя мясціны.<br><br>Назоўнікі ў памяншальна-ласкальнай форме: ____________________<br>____________________<br>____________________<br><br>*(3 балы)* | ___ | ___ | ___ |

| Сума балаў за заданні 7–12 *(макс. 10,5 бала)* | | | |
|---|---|---|---|

## ТЭКСТ Б

Уладзімір Караткевіч – адна з самых яркіх постацяў беларускай літаратуры XX стагоддзя. Ён плённа працаваў як паэт, празаік, драматург, публіцыст, літаратурны крытык, перакладчык і кінасцэнарыст. Асаблівая заслуга У. Караткевіча перад беларускай літаратурай у распрацоўцы гістарычнай тэматыкі. Пісьменнік узняў шырокія пласты нацыянальнай гісторыі, перадаў дух мінулых эпох, стварыў адметныя характары, раскрыў багаты духоўны свет сваіх герояў і звязаў іх асабісты лёс з лёсам народным. У Беларусі ён выканаў тую гістарычную місію, што Вальтэр Скот у Англіі, Генрык Сянкевіч у Польшчы, Алоіс Ірасек у Чэхіі. Уладзімір Караткевіч шмат зрабіў для развіцця адраджэнскіх ідэй, для абуджэння нацыянальнай свядомасці беларусаў. Яго творчасць вызначаецца рамантычнай акрыленасцю, высокай мастацкай культурай, патрыятычным пафасам, значнай пазнавальнасцю і гуманістычным гучаннем.

А. Верабей

*Заданні да тэксту* — *Балы* *I* *II* *III*

**13.** Вызначце стыль тэксту.

**А** Публіцыстычны
**Б** Навуковы
**В** Афіцыйна-дзелавы
**Г** Мастацкай літаратуры

*(0,5 бала)* ___ ___ ___

**14.** *Ён плённа працаваў як паэт, празаік, драматург.* Абапіраючыся на гэтую цытату, назавіце літаратурныя роды, у якіх працаваў У. Караткевіч.

_______________________________________________

*(1,5 бала)* ___ ___ ___

**15.** Падкрэсліце словы, якія называюць віды дзейнасці, да якіх меў дачыненне У. Караткевіч.

акцёр / публіцыст / літаратурны крытык / оперны спявак / перакладчык / кінасцэнарыст / мастак

*(2 балы)* ___ ___ ___

**16.** У чым, на думку А. Верабей, галоўныя заслугі У. Караткевіча перад беларускай літаратурай і беларускім грамадствам? Адкажыце сваімі словамі ці цытатамі з тэксту.

Перад беларускай літаратурай: ______________________________

_______________________________________________

Перад беларускім грамадствам: ______________________________

_______________________________________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 13–16 *(макс. 6 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы* *I* *II* *III*

**17.** У чым асаблівасць твораў У. Караткевіча на гістарычную тэму? Адкажыце словамі тэксту.

___

___

___

___

*(1 бал)* ___ ___ ___

**18.** Што аб’ядноўвае творчасць У. Караткевіча з творчасцю Вальтэра Скота, Генрыка Сянкевіча, Алоіса Ірасека?

___

___

*(1 бал)* ___ ___ ___

**19.** Якія асаблівасці творчасці У. Караткевіча пералічаны ў гэтым тэксце?

___

___

*(2,5 бала)* ___ ___ ___

**20.** Пазначце радок, у якім названы толькі творы У. Караткевіча.

**А** *Непаўторная вясна, Нямоглы бацька, Курган*

**Б** *Паром на бурнай рацэ, Дзікае паляванне караля Стаха, Каласы пад сярпом тваім*

**В** *Людзі на балоце, Дзяльба кабанчыка, Зямля пад белымі крыламі*

*(1 бал)* ___ ___ ___

**21.** З апошняга сказа выпішыце **чатыры** запазычаныя словы.

___

___

*(1 бал)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 17–21 *(макс. 6,5 бала)* | | | |
|---|---|---|---|

## АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА

| II частка (тэст) | Макс. сума | Члены камісіі | | |
|---|---|---|---|---|
| | | I | II | III |
| Сума балаў за заданні 1–6 | 7 | | | |
| Сума балаў за заданні 7–12 | 10,5 | | | |
| Сума балаў за заданні 13–16 | 6 | | | |
| Сума балаў за заданні 17–21 | 6,5 | | | |
| **Сума балаў** | 30 | | | |
| **Акругленая сума балаў** | 30 | | | |

III egzamino dalis

# TEKSTO KŪRIMAS

*З прапанаваных трох тэм сачыненняў і двух тэкстаў для інтэрпрэтацыі Вы павінны выбраць адну тэму альбо адзін тэкст і напісаць працу.*

*Ваша праца павінна быць аб'ёмам 250–400 слоў (1–2 старонкі фармата A4). У чыставіку ад пачатку працы адлічыце 250 слоў, пазначце месца, дзе яны заканчваюцца, і запішыце гэтую колькасць на палях.*

## ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

**1.** "Роўнага яму няма і наўрад ці ўжо будзе, замяніць яго ў нашай літаратуры не можа ніхто", – так ацаніў творчасць У. Караткевіча В. Быкаў. Паразважайце, што дало падставы В. Быкаву так ацаніць творчасць У. Караткевіча.

**2.** Як праз мэты, якія чалавек ставіць перад сабой, выяўляецца сутнасць яго асобы? (Па творах К. Чорнага).

**3.** У чым трагедыя лёсу Міхала? (Па паэме Я. Коласа "Новая зямля").

## ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

**4.** С. Грахоўскі

ДАКОР САБЕ

Жыццё даецца толькі раз,
А я, бывае, марна трачу
І сілы лепшыя, і час,
І не лічу за недастачу
Усё, што сёння разгубіў,
Усё, што мог, а не зрабіў
І што, магчыма, заўтра страчу.
Бо што прайшло, таго не вернеш,
Не скажаш часу: "Пачакай".
Тым часам нехта сее зерні,
А нехта на пярэдні край
Ідзе няходжанаю сцежкай,
У штармавую ноч не спіць,
На новай трасе ставіць вешкі,
Каб стэп вадою напаіць.
І не адкладвае нічога,
Нічога ён не праміне
І недзе, змораны дарогай,
Касцёр распаліць і засне.
Няхай блішчаць ад поту твары,
Хай плечы муляе рукзак –
Шчаслівы той, хто змалку марыў,
Што жыць патрэбна толькі так,
Каб быць заўсёды у дарозе,
Прайсці, дзе следу не было,
Каб у надзённай нашай прозе
Здабыць паэзіі святло.
Каб, узышоўшы на вышыні,
Руку таварышу падаць
І побач стаць на той вяршыні,
Адкуль наступны дзень відаць.
Каб зазірнуць у тыя далі,
Куды нам суджана дайсці,
І, не спыняючыся, далей
Дарогу пэўную знайсці,
Спазнаць цану любой хвіліны
І кожным крокам даражыць:
Шукаць, знаходзіць, быць няспынным,
Не проста існаваць, а жыць.

**5.** М. Танк

РУКІ МАЦІ

Іх цалавала зямля
Сваімі пясчанымі вуснамі
І каласамі;
Неба спякотай, вятрамі, дажджамі
Іх цалавала.
Пража нямала
З іх выпіла ў ночы бяссонныя
Свежасці ранняй.
Колькі яны запалілі світанняў,
Зораў над намі.
Колькі сягоння на іх
Віднеецца чорных, глыбокіх
Шрамоў і маршчынаў,
Гэта сляды, што навекі пакінуў
Шлях наш суровы.
Толькі заўсёды,
Як мы зберымося дамоў
І на стол пакладзе рукі маці,
Быццам ад сонца, ад іх пасвятлее ў хаце
І ў сэрцы.

## ЧАРНАВІК

*Працяг чарнавіка на 10-й старонцы*

## ЧЫСТАВІК

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 11-й старонцы***

***Працяг чарнавіка***

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка***

| I | II | III |
|---|---|---|
| | | |

| III частка (сачыненне) | | | | Сума балаў |
|---|---|---|---|---|
| Змест | Структура тэксту | Стыль мовы | Граматнасць | |
| 20 балаў | 4 балы | 4 балы | 12 балаў | 40 балаў |
| | | | | |